Артлінія

# Прыцягненне агню

Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
фота Віктара Кавалёва

**Выстаўка "Кола агню" ў сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" прадставіла публіцы вынік артпраекта, які штогод набывае ўсё большую папулярнасць і ў саміх творцаў, і ў аматараў эксклюзіўнай аўтарскай керамікі.**

Дзявяты па ліку міжнародны пленэр па кераміцы "Арт-Жыжаль" праходзіў у наваколлі Чыгірынскага вадасховішча — на базе Дома рыбака СВК "Рассвет" імя К. Арлоўскага. Удзельнікамі праекта, вядомага ўжо далёка за межамі Беларусі, былі 23 адмыслоўцы з 10 краін. Апроч нашых суайчыннікаў ля рытуальнага творчага агню "Арт-Жыжаля" гэтым разам сабраліся іх калегі з Балгарыі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Турцыі, Украіны. Заснавальнікі пленэру — Магілёўскі аблвыканкам і Бабруйскі гарвыканкам. Арганізатары — аддзел культуры Бабруйскага гарвыканкама, Бабруйскі мастацкі музей імя Г. Паплаўскага ды гарадская арганізацыя Беларускага саюза мастакоў. А нязменны кіраўнік "Арт-Жыжаля" — віртуоз керамікі, вядомы педагог, бабруйчанін Валерый Калтыгін. Сёлета ўдзельнікам пленэру была прапанавана значная і адказная ў сваёй канкрэтнай, прыкладной сутнасці тэма: "Кераміка ў архітэктурнай прасторы". Таму плёнам 22-дзённага шчыравання керамістаў ля адкрытага агню сталіся не толькі іх індывідуальныя творчыя эксперыменты і знаходкі з выкарыстаннем старажытных беларускіх тэхналогій апрацоўкі гліны, але і работы, створаныя ў адпаведнасці з вызначанымі параметрамі — для афармлення пэўнага інтэр'ера.

Праца азнаменавалася вернісажам новых твораў у Бабруйскім мастацкім музеі імя Г. Паплаўскага. А затым плён творчага натхнення майстроў (або іх творчага гарэння, або малення старажытнаму беларускаму паганскаму богу агню — Жыжалю, апекуну мастакоў-керамістаў!) пабачылі і ў Мінску. Фантастычны "Карабель" маладога беларускага майстра Максіма Калтыгіна; напоўнены гумарам і дабрынёй бальшагаловы "Сабака" бабруйчаніна Алега Ткачова; карункава-крохкая і трапяткая, нібы жывая марская істота, сфера пад назваю "Адзінства ў разнастайнасці", выштукаваная латвійскай мастачкай Эліnай Цітане; "Чайнікі" студэнта ВДУ Рамана Чыгірова — "сямейства" дэкаратыўнага посуду з кідкімі чырвонымі акцэнтамі; тры кранальныя і непаўторна афарбаваныя ўзорыстыя лісточкі — кампазіцыя "Дуб", створаная Кемалем Цізголем, доктарам філасофіі факультэта вытанчаных мастацтваў з турэцкага горада Кампус-Анталія... Багацце ідэй, формаў, фактур, фарбаў!

Выстаўка ўдзельнікаў "Арт-Жыжаля" ўпершыню суправаджалася паказам відэафільма. Дзякуючы гэтым рэпартажным здымкам яе наведвальнікі ўлучаліся ў "Кола агню", спрычыняліся да імправізаванага майстар-класа і шукалі сакрэт ажыўлення звычайнай гліны.



***На здымку:* Алег Ткачоў "Каланізацыя".**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ